**Заключение.** Результаты, полученные в ходе исследования, позволяют взглянуть на становление национального характера русского и польского народа, особенности их быта и менталитета. Выявлены качества и черты человеческого характера, считавшиеся важнейшими, лучшими, и черты, порицаемые народом. Проанализированные сказочные сюжеты помогли нам лучше понять культуру русского и польского народов и найти у них много общего. Очевидно, что это сходство определяет факт, что данные народы имеют общие страницы истории, которые взаимно повлияли на менталитет и сознание поляков и русских. В польских и русских сказках отразились представления трудового народа о добре и зле, социальной справедливости, моральное, а иногда и интеллектуальное превосходство простого народа над эксплуататорами. Именно эти выраженные в сказочных сюжетах надежды и чаяния людей объединяют сказки всех стран мира.

**Список цитируемых источников**

1. *Аникин, В. П.* Русская народная сказка : пособие для учителей / В. П. Аникин. — М. : Просвещение, 1977. — 208 с.
2. ФЭБ: Сказка [Электронный ресурс] // Литературная энциклопедия. — 2003. — Режим доступа: http://refdb.ru /look/3320811-pall.html . — Дата доступа: 07.10.2016.
3. *Щербакова, А.* Польские народные сказки / А. Щербакова, Я. Мацюсович. — Л. : Художеств. лит., 1980. — 328 с.
4. *Афанасьев, А. Н.* Народные русские легенды / А. Н. Афанасьев. — М. : Директ-Медиа, 2014. — 266 с.

УДК 821.161.3*Я.Сіпакоў

**В. У. Гулькевіч**
*Установа адукацыі «Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны», Гомель*

## ЖАНРАВЫЯ ПОШУКІ Ў ТВОРЧАСЦІ ЯНКІ СІПАКОВА

**Уводзіны.** Праблема жанру з’яўляецца адной з найбольш складаных у літаратуразнаўстве. Гэта тлумачыцца прыродай самога жанру, яго зменлівасцю пад уплывам зрухаў у сацыяльным і духоўным жыцці грамадства. Кожная гістарычная эпоха абумоўлівае ўзнікненне спецыфічных жанравых форм. Калі мець на ўвазе літаратуру апошніх дзесяцігоддзяў, то асабліва лёгка заўважыць тэндэнцыю да абнаўлення многіх жанравых структур, іх узаемапранікненне і ўзбагачэнне на гэтай аснове. Сінтэз мастацкіх форм — працэс настолькі пашыраны, што адноснасць жанравай чысціні ўжо не выклікае сумнення. Нягледзячы на тое, што прырода пэўнага літаратурнага роду захоўваецца, «змешанасць», сінкрэтычнасць шмат у чым адрознівае многія жанравыя структуры ад іх класічных узораў. Даследчык А. Яскевіч ахарактарызаваў гэтую з’яву як «перафарміраванне, дынаміку жанраў» [1, с. 169].

**Асноўная частка.** Янка Сіпакоў — адзін з нямногіх беларускіх пісьменнікаў, у чыёй творчасці заключаюцца вялікія мастацкія патэнцыі ўніверсальнага плана на мяжы двух амаль узаемавыключальных родавых утварэнняў літаратуры — эпікі і лірыкі. Духоўная і творчая эвалюцыя гэтага творцы ўяўляе досыць цікавы феномен у сучаснай беларускай культуры, калі энцыклапедызм творчых памкненняў, скіраванасць на жывы і рухомы эстэтычны аб’ект, на адноснасць жанравых форм і абсалютнасць духоўнага зместу гавораць аб аўтары як аб унікальнай творчай індывідуальнасці.

Глыбокая інтэлектуальнасць яго творчасці вынікае з ведання фальклору, міфалогіі, гісторыі народаў свету і ўвасабляецца ў надзвычай шырокай жанравай палітры, якая ўключае і класічныя формы (санеты, трыялеты, балады), і верлібр, і прозу (лірычныя мініяцюры, апавяданні, аповесці), і публіцыстыку (нарысы, артыкулы). Аднак якімі б разнастайнымі па родава-жанравым выяўленні ні былі яго творы, ён застаецца паэтам. Як слушна заўважае даследчыца А. Лысенка, «паэтычнасць светаадчування вызначае стылявую дамінанту вершаў, апавяданняў, аповесцей, нарысаў Янкі Сіпакова і адпаведна — месца гэтага пісьменніка як прадстаўніка лірычнага напрамку ў сучаснай беларускай літаратуры» [2, с. 3].

Адзначым, што ўжо першая кніга «Сонечны дождж» (1960) спалучае ў адзінае цэлае лірыку і эпас, фактычна ўвесь зборнік уяўляе сабой ліра-эпічную паэму. Менавіта адсюль была пракладзена вялікая дарога, ад якой потым пойдуць у розныя бакі шляхі майстра як паэта, празаіка, нарысіста, публіцыста, эсэіста, сатырыка і перакладчыка.

Аўтар часам «у палоне» эпічнай змястоўнасці, вершам тады не стае рухомасці і прасторы, імкнення палёту. Адносную свабоду на шляху гарманічнага паяднання разнародных стыхій паэт набыў у зборніку «Лірычны вырай» (1965), калі думка аўтара набірала сваю сілу і моц. У гэтай кнізе Янка Сіпакоў, па словах М. Стральцова, «таленавіта адмовіўся ад сябе, ад сваёй здольнасці пісаць вершы — у імя здольнасці мысліць імі» [3, с. 176].

© Гулькевіч В. У., 2017

Репозиторий БарГУ

Новая «выпакутаваная» паэзія з’яўляецца ў зборніку «Дзень» (1968), у якой свет значна ўскладнены і не пазначаны аднамернасцю метафізічнага прымітыву. Лірычны эстэтызм паэта знаходзіць сваё завяршэнне не ў паэзіі эпічнай, іманентнай прыгажосці, а ў паэзіі залежнай красы, дзе на першым плане стаіць духоўны пачатак, які толькі і можа ўратаваць свет.

Значным дасягненнем на шляху спасціжэння гісторыі як самакаштоўнасці стала кніга «Веча славянскіх балад» (1973), якая спалучыла ў сабе жанрава-стылявую шматстайнасць мастацтва. Баладная форма аказалася асабліва спрыяльнай для сінтэзу ўзаемавыключальнага і разнароднага матэрыялу. Баладу ў гэтым аспекце можна ўмоўна характарызаваць як досыць сінтэтычнае ўтварэнне, але з перавагай драматычнага зместу.

Цікавым у плане душэўнага сталення лірычнага героя з’яўляецца зборнік паэзіі «У поўдзень, да вады» (1976). Самым важным тут з’яўляецца вынік духоўнай эвалюцыі пісьменніка. Уся кніга запоўнена незвычайнай душэўнасцю, адчуваннем нейкага шчымлівага болю за чалавека. Як адзначае навукоўца Д. Санюк, «вызначальнай рысай у творчасці Я. Сіпакова з’яўляецца тое, што эпічная тэндэнцыя неад’емна суіснуе разам з лірычнай стыхіяй. Чыста лірычных вершаў у яго амаль няма. Янка Сіпакоў заявіў пра сябе як лірык з эпічнымі пошукамі або, лепш сказаць, як эпік з «лірычным голасам» [4, с. 677].

Імклівая і шматстайная эстэтыка мастацкіх форм прывяла Я. Сіпакова да стварэння цыкла санетаў «Жанчына». Творца выкарыстоўвае адну з самых камерных лірычных форм — санет, якая тут сапраўды, па словах А. Лысенкі, «у пэўнай меры знімае “стомленасць” верлібра» [2, с. 92].

Кніга паэм у прозе «Ахвярны двор» (1991) вызначаецца скіраванасцю да жахлівых трагедый веку — землятрусу ў Арменіі і Чарнобыльскай катастрофы, а таксама да драматычнага лёсу Т. Шаўчэнкі і лёсу Абхазіі, да ўражанняў ад наведвання пушкінскага Міхайлаўскага. Моцны публіцыстычны элемент кнігі — вынік пісьменніцкай неабыякавасці да жыцця, калі знешні свет стаў унутраным болем паэта. Мастацкасць спалучаецца з выразнай адкрытасцю пачуцця пісьменніка, калі патрэбна адэкватная форма выражэння набалелага на душы.

Як празаік Янка Сіпакоў пачаў сваю творчасць з нарысаў «Акно, расчыненае ў зіму», «Даверлівая зямля», «Па зялёную маланку», «Там, дзе Сібір», якія склалі асобную кнігу «Па зялёную маланку» (1971).

Пасля з’яўляецца першая кніга прозы «Крыло цішыні» (1976) з падзагалоўкам «Кніга вёскі». Пераход да прозы вельмі натуральны для паэта. Хутчэй за ўсё гэта вытлумачваецца скіраванасцю таленту пісьменніка да аб’ектывізму. І калі паэтычна-суб’ектыўны бок таленту адлюстравання жыцця знайшоў дастаткова поўнае ўвасабленне ў шэрагу кніг паэзіі, то эпічна-аб’ектыўны яшчэ не выявіўся цалкам, хоць ён вельмі значны для паэта. Сацыяльна-аб’ектывізаваныя структуры аўтара патрабавалі празаічнай сферы, дзе і магла з’явіцца пэўная тоеснасць паміж творчым памкненнем і яго рэалізацыяй. Суб’ект лірыкі Я. Сіпакова нібы пераходзіць у прозу і апасродкавана праз шэраг знешніх узаемаабумоўленых элементаў становіцца раўназначным аб’екту. Сюжэтнасць, прадметнасць і канкрэтнасць, якія былі відавочнымі ў лірыцы і асабліва ў баладах мастака, атрымалі працяг у прозе, дзе гэтыя элементы набылі сваё натуральнае і ўласна-самастойнае жыццё.

У наступнай кнізе прозы Я. Сіпакова «Жанчына сярод мужчын» (1980) аўтар пайшоў па шляху далейшай эпізацыі. Апавяданні з гэтай кнігі закранаюць важныя праблемы духоўнага жыцця як на вайне, так і ў мірны час. Як зазначае Д. Санюк, «“чалавек сярод людзей” — стрыжнёвая лінія апавяданняў» са згаданай кнігі [4, с. 676].

Пошукі ў жанравых межах апавядання Я. Сіпакоў працягнуў у сваіх наступных кнігах «Спадзяванне на радасць» (1983) і «Пяць струн» (1984). Аўтар развівае папярэднія матывы сваёй творчасці, калі можна «з упэўненасцю гаварыць аб абумоўленасці мастацкага ўзроўню твора мерай яго духоўнасці» [2, с. 87]. «Геаграфія» апавяданняў падпарадкоўваецца аб’ёмнай прасторы мастацкага слова, значнасці прадмета адлюстравання. Стракатасць сюжэтна-кампазіцыйнай і ідэйна-эстэтычнай структуры апавяданняў выяўляе імкненне мастака ахапіць жыццё цалкам, сінтэтычным метадам наблізіцца да разумення яго першаасноў.

Кніга прозы «Журба ў стылі рэтра» (1990) працягнула лінію паэтычнай «аб’ектывізацыі» таленту пісьменніка. Своеасаблівы касмізм таленту Я. Сіпакова, увага да жахлівага нядаўняга мінулага і драматычнага сённяшняга вызначае агульны каларыт кнігі.

Цікавай падзеяй у літаратурным жыцці стаў выхад кнігі прытчаў «Тыя, што ідуць» (1993), першай такога плану ў беларускай літаратуры. Невыпадкова маштабны талент мастака скіроўвае яго ў рэчышча дадзенага жанру, таму што прытча — адна з самых універсальных форм адлюстравання супярэчлівай і парадаксальнай рэчаіснасці. У прытчах Я. Сіпакова жыццё паўстае ва ўсёй разнастайнасці сваіх праяў. Прастора і час не абмяжоўваюць іх дзеянне, у якім пераплецены рэальнае і ірацыянальнае, жыццёвае і прывіднае. Як сцвярджае даследчык А. Пяткевіч, «у любові аўтар адкрывае нянавісць, у жыцці — смерць, у волі — турму, у слабасці — сілу, ва ўзвышаным — звычайнае. На парадоксах трымаюцца паводзіны персанажаў, парадоксы высвятляюць таямнічую складанасць чалавечага жыцця» [5, с. 241].

Янка Сіпакоў — аўтар фантастычна-прыгодніцкай аповесці «Блуканне па іншасвеце», цыклаў мініяцюр («Наталенне смагі», «Дні за спіною», «Паміж сонцам і дажджом»), эсэ («Коні», «Паляванне», «Мужчыны»), зборнікаў гумарэсак («Лысы юбілей», «Плюс на мінус», «Ланцугі для мух»). Вядомы ён як перакладчык твораў А. Пушкіна, А. Блока, А. Міцкевіча, А. Туманяна, С. Квазімоды, І. Межэлайціса і інш.



Репозиторий БарГУ

**Заключэнне.** Творчае быццё Янкі Сіпакова выражаецца ў імкненні да пераўвасаблення, да душэўнай рэалізацыі сябе ў пэўным вызначаным тыпе лірычнага суб'екта альбо празаічнага героя. Паэт як бы не вытрымлівае «сцэнічнай эфектнасці» паэзіі і пераходзіць да адлюстравання аб'ектыўнага свету ў эпасе. Факт існавання ў адной асобе лірыка і празаіка выражае заканамерны працэс творчага пошуку Я. Сіпакова. Парадаксальнасць сваіх паэтычных парываў адчуваў і сам аўтар: «Творчасць — гэта нейкая падсвядомая энергія, якая выпраменьваецца сама па сабе, без удзелу нашых нецярплівых жаданняў, а часам і насуперак ім, і не паддаецца звычайнаму для звычайных рэчаў уліку і разгляду» [2, с. 8].

**Спіс цытуемых крыніц**

1. *Яскевіч, А.* Карані маладога дрэва : літ.-крыт. арт. / А. Яскевіч. — Мінск : Беларусь, 1967. — 203 с.
2. *Лысенка, А.* Лінія гарызонта : нарыс творчасці Янкі Сіпакова / А. Лысенка. — Мінск : Навука і тэхніка, 1986. — 119 с.
3. *Стральцоў, М.* Лінія паэтычнага гарызонту / М. Стральцоў // Полымя. — 1966. — № 5. — С. 251—257.
4. *Санюк, Д.* Янка Сіпакоў / Д. Санюк // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. У. Гніламёдаў, С. Лаўшук. — Мінск : Беларус. навука, 2002. — Т. 4. Кн. 1. — 1966—1985. — 928 с.
5. *Пяткевіч, А.* Паміж зямлёю і небам / А. Пяткевіч // Полымя. — 1994. — № 9. — С. 241—244.

УДК 81

**А. И. Дейлид**
*Учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи*

# ВУЛЬГАРИЗМЫ, ИСПОЛЬЗУЕМЫЕ ДЛЯ СОЗДАНИЯ КОМИЧЕСКОГО ЭФФЕКТА В ПРОИЗВЕДЕНИЯХ МИХАИЛА ЗОЩЕНКО

**Введение.** Комическое является одной из основных категорий эстетики, которая описывает курьезные стороны жизни. Данное понятие трактовалось не только авторами античности, но и писателями последующих веков до наших дней. Таким образом, понятие комического актуально и в настоящее время.

Под комическим понимается смешное, которое имеет безграничную общественную значимость. Оно обусловливает социально окрашенный смех, который направлен на конкретный объект. Однако понимание комического в его историческом, национальном и классовом аспектах строго определено. Следует отметить, что все виды искусства способны образовывать комедийные отображения [1].

**Основная часть.** В комическом всегда прослеживается какое-то противоречие, отклонение от нормы, которое выражается, как правило, на языковом уровне. Основная цель комизма представляет собой употребление языковых средств в комическом аспекте. Анализ научной литературы показывает, что ученые выделяют различные формы комического, однако основными формами большинство исследователей в своих работах рассматривают такие формы комического, как **юмор** и **сатира.** Автор юмористического или сатирического произведения отбирает такие языковые единицы, которые обладают комическим свойством. Писатель также должен уметь придать тем или иным языковым средствам сатирический или юмористический оттенок.

Сатира и юмор имеют не только сходства, но и различия. Общее для сатиры и юмора — комедийное отношение к происходящему [2].

Юмористическая позиция неагрессивна. Так, А. Н. Лук формулирует юмор как беззлобную насмешку [3]. Юмор трактует пороки жизни и человеческие слабости как нечто такое, что заслуживает снисхождения, а сатирическая позиция означает всегда последовательное и бескомпромиссное соперничество со злом, для сатирика не характерна снисходительность.

Считается, что чувство юмора шире любого определения, так как это сложное душевное качество. Юмор как форма терпимости и миролюбия противопоставляется боевой и бескомпромиссной сатире, а в связи со склонностью к рефлексии — также примитивным формам комизма.

Сатира относится к высшему виду критики. Она не только заостряет, но и изменяет облик осмеиваемого явления.

Исследователь Г. Н. Поспелов считает, что объект сатиры можно видеть только в лицах, обладающих «высоким положением»: «Когда люди, обладающие властью, силой, значительностью, претендующие на уважение, внутренне оказываются несостоятельными, пустыми, бессодержательными, они вызывают насмешку» [4]. Однако мы придерживаемся мнения, что сатира может быть направлена на выявление негативных сторон любого человека, независимо от социального положения.

Актуальность темы связана с необходимостью научного осмысления места сатиры и юмора в русскоязычном пространстве. Писатель Михаил Зощенко известен как автор юмористических и сатири-

© Дейлид А. И., 2017

Репозиторий БарГУ